WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на родняй мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

16 жніўня 2011 г. АЎТОРАК

№ 154 (27018)

Кошт 700 рублёў

## БЕЛАРУСЬ МАЕ НАМЕР НАДАЦЬ ПАРТНЁРСТВУ З КАТАРАМ СТРАТЭГІЧНЫ ХАРАКТАР

Фота БЕЛТА.



**Беларусь мае намер надаць супрацоўніцтву з Катарам характар стратэгічнага партнёрства як у палітычнай, так і ў эканамічнай сферы. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора ў ходзе сустрэчы з Эмірам Дзяржавы Катар шэйхам Хамадам бен Халіфой аль-Тані, перадае БЕЛТА.**

«Мы зноў пераканаліся ў гатоўнасці катарскіх партнёраў ісці нам насустрач, шукаць шляхі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. У нас ужо ёсць пэўныя ўстаноўкі, але галоўнае — напрацоўкі, галоўнае — добрая воля, моцная дружба і ўзаемапавага, якія звязваюць нашы народы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

## Чацвёрты фестываль палескай кухні прайшоў на Іванаўшчыне



## «МАТАЛЯНЕ ВАМ ГАТУЮЦЬ, МАТАЛЯНЕ ВАС ЧАСТУЮЦЬ!»

**«Мотальскія прысмакі» ў чарговы раз сабралі старых і новых прыхільнікаў. Зранку ў суботу аўтобус ці машыну бліжэй да цэнтра Моталя прыпаркаваць было амаль немагчыма. Таму да месца святкавання ўжо традыцыйнага мерапрыемства давялося больш за паўкіламетра прайсці пехатой. І адразу за брамай гасцей сустракалі народныя майстры. Мотальская ткачыха Марыя Кульбяда давала майстар-клас для ўсіх ахвотных. Станок у Марыі Васільеўны старадаўні, застаўся ад маці, а той перайшоў ад яе маці. Але працуе ён і сёння бездакорна. І на ім гаспадыня тчэ тонкае бялюткае з узорамі палатно. Найбольш — на ручнікі, а таксама на абрусы, сурвэткі, іншую прыгажосць. У бабулі Марыі расце шасцёра ўнукаў, усім трэба наткаць, нашыць.**

СТАР. 5

## ЭКАНОМІКА РЭГІЁНА: ПОЗІРК ЮРЫСТА

Віктар КАМЯНКОЎ, Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь



**ПАСПЯХОВАЕ развіццё любой галіны эканомікі небеспадстаўна залежыць ад дэталёвага і правільнага аналізу кожнага этапа такога развіцця. Узровень традыцыйных падвядзенняў вынікаў за паўгадавы перыяд органамі мясцовай улады, калі ён належны, дае магчымасць праз аналітыку якасных паказчыкаў эканомікі спланаваць задачы на будучыню максімальна эфектыўна. Гэта — у тэорыі. А як на практыцы? Не прэтэндуючы на ўсеагульную і комплексную ацэнку работы мясцовых органаў кіравання, маю намер падзяліцца некаторымі разважаннямі на гэты конт, бо погляд юрыста-прафесіянала з пэўным вопытам эканамічнага правасуддзя на праблемы эканомікі дазваляе заўважыць істотныя дэталі.**

### Вынікі за паўгода: падставы для аптымізму ёсць

На пасяджэнні аблвыканкама[1] разглядаліся вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця і асваення бюджэту вобласці за першае паўгоддзе 2011 года. Правільная арганізацыя такога мерапрыемства вызначае развіццё рэгіёна часам не толькі на канкрэтны год, але нават на пяць гадоў наперад. Варта адзначыць прафесіяналізм падрыхтоўкі пытанняў, азначаных у парадку дня.

СТАР. 4

[1] Гаворка ідзе пра Гомельскі аблвыканкам, але многія рысы ўласцівыя і іншым аблвыканкамам.

## РАСІЯ З 2012 ГОДА ЎВОДЗІЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСІ ПАНІЖАЮЧЫ КАЭФІЦЫЕНТ ФОРМУЛЫ ЦАНЫ НА ГАЗ

**Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін па выніках праведзенага ўчора ў Маскве пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, перадае БЕЛТА.**

Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што Расія, прымаючы гэта рашэнне, зыходзіла з таго, што ў рамках інтэграцыйных працэсаў бакі павінны выйсці на ўмовы роўнай канкурэнцыі. Ён адзначыў, што гэта рашэнне расійскага боку для Беларусі «не зусім падарунак, паколькі для расійскіх кампаній пашыраюцца магчымасці на беларускім рынку».

Беларусь і Расія плануюць стварыць сумесную карпарацыю ў мікраэлектроніцы. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы.

Сяргей МАСКЕВІЧ:

Надзённае

## «Імідж прафесіі педагога — тэма выключнай важнасці»



**КОЖНАМУ навучальнаму году папярэднічаюць педагагічныя канферэнцыі, якія праходзяць ва ўсіх, без выключэння, рэгіёнах Беларусі. Але сёлета завяршальным акордам стане рэспубліканская нарада педагагічнага актыву з удзелам кіраўніка нашай дзяржавы, якая пройдзе ў апошнія жнівеньскія дні: такое рашэнне было прынята падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком адукацыйнай галіны.**

— Прэзідэнт чакае ад нас шчырай, максімальна прадметнай і актуальнай дыскусіі, а не нейкіх пафасных справаздач, — падкрэсліў у гутарцы з журналістам «Звязды» **міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ.** — Мушу канстатаваць, што многія праблемныя пытанні ўзнімаюцца ў розных аўдыторыях і на розных трыбунах настолькі часта, што ад іх папросту сталі адмахвацца. Аднак калі мы не зможам разам знайсці на іх адказ, знайсці шляхі вырашэння праблем, то далей рухацца будзе праблематычна. Напрыклад, калі мы спрабуем ахарактарызаваць якасць і эфектыўнасць работы навучальных устаноў, то, як правіла, спасылаемся на колькасныя паказчыкі: гадавыя і экзаменацыйныя адзнакі, працэнт паступлення выпускнікоў у ВНУ, вынікі ўдзелу вучняў у рэспубліканскіх і міжнародных прадметных алімпіядах... Але ці заўсёды апраўданы такі падыход? Якімі намаганнямі і выдаткамі (эканамічнымі, фізічнымі, псіхалагічнымі, педагагічнымі) дасягаюцца гэтыя вынікі? Дзякуючы дэмаграфічнай сітуацыі стаць студэнтам ВНУ становіцца ўсё прасцей з кожным годам.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

Стыхія

## ПРАРВАЛА ДАМБУ, ПАДТАПІЛА ДАМЫ І ПАДВОРКІ

**14 жніўня ў 17.25 выратавальнікі атрымалі сігнал пра разбурэнне ўчастка дамбы вадасховішча ў вёсцы Гардынава Валожынскага раёна.**

Паводле інфармацыі МНС, з-за ападкаў (45 міліметраў за суткі пры месячнай норме 81 міліметр) паднялася вада і разбурыўся ўчастак дамбы працягласцю 12 метраў. Падтоплены 82 прыватныя жылыя дамы і 105 падворкаў па вуліцах Кастрычніцкай, Пушкіна, Набярэжнай, 60 гадоў БССР, размыты два ўчасткі аўтамабільных дарог. Разбураны адзін аўтамабільны мост, два — часткова пашкоджаныя. Аднак транспартныя зносіны не парушыліся, існуе магчымасць аб'езду.

Тут жа быў аб'яўлены збор асабістага саставу Валожынскага раённага падраздзялення МНС, а праз некалькі хвілін — збор асабістага саставу Мінскага, Дзяржынскага, Стаўбцоўскага і Маладзечанскага падраздзяленняў МНС.

Выратавальнікі эвакуіравалі 63 чалавекі, таксама ім аказана дапамога па эвакуацыі маёмасці. Выратаваная пенсіянерка 1929 года нараджэння: у доме пачаў падымацца ўзровень вады, а сіл самастойна падняцца ў бабулі не было. З дому яе вынеслі работнікі МНС, перадаўшы затым медыкам. Медработнікі правялі абследаванне людзей, тры чалавекі — адзінокія, састарэлыя грамадзяне — дастаўлены ва ўстановы аховы здароўя. На шчасце, яны не пацярпелі. Размясціліся жыхары падтопленых дамоў — да падзення ўзроўню вады — у родных і знаёмых.

Раніцай 15 жніўня людзі вярнуліся ў свае дамы. Тэхнікай МНС іншых арганізацый пастаянна праводзіцца адпампоўванне вады з прыватных домаўладанняў. Для ліквідацыі наступстваў стыхіі былі задзейнічаны 33 адзінкі тэхнікі і 84 супрацоўнікі МНС, 18 адзінак тэхнікі і 30 чалавек з іншых арганізацый і службаў узаемадзеяння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЖНІВЕНЬСКІЯ СУМЁТЫ

Вось так выглядала траса Вільнюс — Мінск у мінулую нядзелю надвячоркам на тэрыторыі Валожынскага раёна. Гэтыя гурбы нарабіў град. Нам пашчасціла не патрапіць пад сам залп, а ўбачыць толькі наступствы. Асобныя градзіны былі памерам з перапялінае яйка. Застаецца толькі паспачуваць тым гаспадарам, на сады і агароды якіх абрынулася стыхія. Ды і кіроўцам, якіх град заспеў у дарозе, не пазайздросціш. На шчасце, ніводнай





Траса Вільнюс—Мінск.

ахвяры на абочыне не было. Многія машыны спыняліся толькі дзеля таго, каб больш уважліва разглядзець гэтыя незвычайныя гурбы. Адчуванне было, што нейкая машына часу ў адно імгненне перанесла нас са жніўня ў лістапад ці снежань.

**Ірына ТАМКОВІЧ.**

белагропромбанк
традиции будущего

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» СООБЩАЕТ,

*что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»*

**31 августа 2011 года**

**ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

Повестка дня

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 15 августа 2011 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 18 августа по 26 августа т.г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 26 августа 2011 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка, филиалов (отделений) по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 54 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

**Телефон для справок: 8(017) 229 64 54.**

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# У Беларусі прыняты меры па абмежаванні росту кошту будаўніцтва жылля

**Адпаведны ўказ № 361 «Аб удасканаленні парадку вызначэння кошту будаўніцтва аб'ектаў і ўнясенні змяненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» Аляксандр Лукашэнка падпісаў 11 жніўня, паведаміў БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Дакументам прадугледжваецца распрацоўваць каштарысную дакументацыю на будаўніцтва аб'ектаў незалежна ад крыніц фінансавання на падставе нарматываў расходу рэсурсаў, якія зацвярджаюцца ў парадку, прынятым Саветам Міністраў, і вызначаць каштарысны кошт будаўніцтва аб'екта на ўстанаўліваемую заказчыкам дату пачатку выканання будаўніча-мантажных работ з улікам нарматыўнай працаёмкасці будаўніцтва.

Згодна з указам праектная (каштарысная) дакументацыя павінна распрацоўвацца рэсурсным метадам, што прадугледжвае прымяненне дзеючых (бягучых) цэн або сярэдняўзважаных цэн на падставе нарматываў расходу рэсурсаў, якія зацвярджаюцца ў арганізацыі, а пры іх адсутнасці — на падставе ўзбуйненых нарматываў кошту будаўніцтва аб'ектаў і аб'ектаў-аналагаў. Узбуйненыя нарматывы кошту будаўніцтва аб'екта і аб'екты-аналагі будуць прымяняцца ў асноўным пры праектаванні на стадыі абгрунтавання інвеставання ў будаўніцтва або на стадыі архітэктурнага праекта. Абавязковымі складальнікамі каштарыснай дакументацыі пры гэтым з'яўляюцца ведамасць аб'ёмаў работ і ведамасць рэсурсаў.

Гэта дасць магчымасць забудоўшчыку фарміраваць цану аб'екта будаўніцтва з прымяненнем прагнозных індэксаў цэн у будаўніцтве, распрацоўка і зацвярджэнне якіх павінны будуць ажыццяўляцца ва ўстаноўленым парадку для вызначэння нязменных дагаворных (кантрактных) цэн на будаўніцтва аб'ектаў.

Укараненне прапануемай сістэмы цэнаўтварэння забяспечыць зніжэнне кошту будаўніцтва.

Указ таксама змяшчае нормы, якія забяспечваюць удасканаленне арганізацыі інвестыцыйна-будаўнічага працэсу, а менавіта ўскладанне на генеральнага падрадчыка распрацоўкі будаўнічага праекта з прадастаўленнем яму права на выкарыстанне сродкаў ад атрыманай эканоміі; пашырэнне паўнамоцтваў Мінбудархітэктуры на рэгуляванне цэн у будаўніцтве.

Гэта мера накіравана на стварэнне практычных рычагоў па абмежаванні росту кошту будаўніцтва жылля. У сувязі з гэтым Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ўпаўнаважана рэгуляваць цэны не толькі на праводзімыя работы пры будаўніцтве аб'ектаў, але і на аказваемыя паслугі, будаўнічыя матэрыялы, вырабы, канструкцыі, якія выкарыстоўваюцца пры будаўніцтве гэтых аб'ектаў.

Што датычыцца будаўніцтва жылля і аб'ектаў, якія ўзводзяцца за кошт сродкаў бюджэту, то рэгуляванне цэн на будаўнічыя матэрыялы, вырабы і канструкцыі будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Прынятае рашэнне дасць магчымасць удасканаліць цэнаўтварэнне ў будаўніцтве, укараніць у практыку будаўніцтва нязменныя дагаворныя (кантрактныя) цэны.

## У Беларусі ліквідуецца канцэрн «Белбіяфарм» і ствараецца Дэпартамент фармацэўтычнай прамысловасці

У Беларусі да 1 студзеня 2012 года ліквідуецца Беларускі дзяржаўны канцэрн па вытворчасці і рэалізацыі фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прадукцыі і ствараецца ў Міністэрстве аховы здароўя Дэпартамент фармацэўтычнай прамысловасці з правамі юрыдычнай асобы. Адпаведны ўказ № 360 «Аб удасканаленні сістэмы дзяржаўнага кіравання фармацэўтычнай прамысловасцю ў Рэспубліцы Беларусь» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 11 жніўня, паведаміў БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Прадугледжваецца, што колькасць работнікаў дэпартамента складзе 30 чалавек. Ускладанне на Міністэрства аховы здароўя функцый правядзення адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі (лекавых сродкаў, фармацэўтычных субстанцый і лекавай раслiннай сыравіны) выводзіць яго на якасна новы ўзровень работы. Істотна пашырыць спектр задач і функцый Міністэрства аховы здароўя перападпарадкаванне яму ведамасных арганізацый аховы здароўя, якія фінансуюцца з бюджэту (Мінспорту, санаторна-курортных арганізацый і арганізацый аховы здароўя Мінтранса і Мінадукацыі).

## АСТАНКІ ВОІНАЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ЎРАЧЫСТА ПЕРАПАХАВАНЫ 14 ЖНІЎНЯ Ў МІНСКУ

**Урачыстая цырымонія перапахавання астанкаў воінаў Першай сусветнай вайны прайшла 14 жніўня на Мінскіх брацкіх ваенных могілках 1914—1918 гадоў, перадае БЕЛТА.**

На гэтых могілках пахаваны 5 тыс. воінаў, якія аддалі свае жыцці за Айчыну. «Вядомых і невядомых герояў той вайны ледзь не паглынуў зыбкі пясок гісторыі, — сказаў на цырымоніі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей. — Адраджэнне Мінскіх брацкіх ваенных могілак — гэта не толькі сімвал духоўнагаператварэння грамадства, але і даніна ўдзячнасці тым, хто склаў галаву ў баях за родную зямлю».

Вайна прыйшла ў Беларусь восенню 1915 года. Расійска-германскі фронт расцягнуўся на 400 км. Тут прайшлі буйнейшыя бітвы, бязлітасныя і крывапралітныя. У раёне возера Нарач кайзераўскія войскі ўпершыню на Заходнім фронце прымянілі зброю масавага паражэння — удушлівыя газы.

«Стрворань па рашэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі мемарыял у гонар герояў і ахвяр Першай сусветнай вайны сімвалізуе адняўленне гістарычнай справядлівасці. Ён з'яўляецца сведчаннем таго, што мы, сучасныя беларусы, — народ, які з павагай ставіцца да свайго мінулага і яго герояў, па-хрысціянску шануе памяць тых, хто загінуў пры выкананні воінскага абавязку», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

# БЕЛАРУСЬ МАЕ НАМЕР НАДАЦЬ ПАРТНЁРСТВУ З КАТАРАМ СТРАТЭГІЧНЫ ХАРАКТАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У той жа час, на яго думку, «на жаль, эканамічнае ўзаемадзеянне пакуль адстае ад палітычнага, і мы зацікаўлены ў выраўноўванні гэтага дысбалансу».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Беларусь і Катар могуць эфектыўна ўзаемадзейнічаць у сферах энергетыкі, нафтахіміі, транспарту, сувязі і тэлекамунікацый, будаўніцтва, вытворчасці прадуктаў харчавання і будматэрыялаў. На думку Прэзідэнта, прыцягненне інвестыцый і ведаў у гэтыя сектары эканомікі дасць магчымасць атрымаць найбольшы эфект.

Прэзідэнт з задавальненнем адзначыў моцныя змяненні. Ён сказаў, што ўражаны тым прагрэсам, якога дабілася Дзяржава Катар з часу яго папярэдняга візіту ў гэту краіну. Аляксандр Лукашэнка таксама з задавальненнем адзначыў, што Катар застаецца апорай стабільнасці і бяспекі ў рэгіёне.

Дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Дзяржавай Катар устаноўлены ў студзені 1996 года. Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Катарам мае канструктыўны характар. Пазіцыі дзвюх краін супадаюць па асноўных пытаннях міжнароднага парадку дня.

Па выніках перамоў у ходзе афіцыйнага візіту падпісана дзевяць дакументаў. Сярод іх міжурадавае пагадненне пра паветраныя зносіны, пагадненне пра супрацоўніцтва ў прававой сферы, міжурадавае пагадненне пра кантакты ў галіне сродкаў масавай інфармацыі.

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» проводит торги по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «Бизнесплюс», находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве).**

**Продавец:** общество с ограниченной ответственностью «Бизнесплюс», 210001, г. Витебск ул. Ленинградская, 134а, комн. 3, тел. (029) 688 27 55.

**Организатор торгов:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42 61 62, (029) 514 36 47.

| № лота | Наименование объекта, его краткая характеристика | Начальная цена без учета НДС (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. | Изолированное помещение с инв. № 200/D-121585, общая площадь – 26,8 кв.м, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения, расположенное по адресу: г. Витебск, Октябрьский район, ГСК № 18, блок гаражей № 30, гараж № 1; изолированное помещение с инв. № 200/D-121587, общая площадь – 24,1 кв.м, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения, расположенное по адресу: г. Витебск, Октябрьский район, ГСК № 18, блок гаражей № 30, гараж № 2; изолированное помещение с инв. № 200/D-121588, общая площадь – 23,1 кв.м, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения, расположенное по адресу: г. Витебск, Октябрьский район, ГСК № 18, блок гаражей № 30, гараж № 3. | 15 700 000 | 1 570 000 |

Торги в форме открытого аукциона состоятся **16.09.2011 г. в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи заявлений: **15.09.2011 г. до 17.30.**

1. Для участия в аукционе приглашаются юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы.

2. Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении о проведении торгов;

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, (без нотариального засвидетельствования);

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. НДС в размере 20% от цены продажи имущества лота оплачивается Победителем аукциона сверх цены приобретенного имущества.

5. Победитель аукциона (участник, выигравший аукцион) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения.

6. Победитель аукциона (участник, выигравший аукцион) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее одного месяца со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием кредиторов или комитетом кредиторов.

7. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона № 3012218220012 в головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» г. Витебска, ул. Ленина, 22/16, МФО 150801701, УНП 390477566 (в бел. руб.), № 3012000009469 (в дол. США) в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, ул. Гоголя, 8, МФО 150801259, УНП 390477566. Лицам, не выигравшим торги, задаток возвращается.

8. Организатор аукциона после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

9. Всем участникам предоставляется право ознакомления с предметом аукциона, а также возможность осмотра предмета аукциона.

**Контактные тел. (0212) 42 61 62, (029) 514 36 47, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

## Минский районный исполнительный комитет 25 августа 2011 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Мачулищанский п/с, д. Мачулищи | 623675202001000269 | 0,1036 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 546 200 | 41 000 000 | 4 100 000 |
| 2 | Михановичский с/с, д. Кайково | 623684202601000255 | 0,1368 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 3 | Михановичский с/с, д. Кайково | 623684202601000256 | 0,1368 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 4 | Михановичский с/с, д. Серафимово | 623684206101000314 | 0,1224 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 5 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 4 | 623684200601000033 | 0,1445 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 34 000 000 | 3 400 000 |
| 6 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 13 | 623684200601000038 | 0,1536 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 36 000 000 | 3 600 000 |
| 7 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 21 | 623684200601000061 | 0,1330 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 31 000 000 | 3 100 000 |
| 8 | Михановичский с/с, д. Котяги, участок № 10 | 623684203601000243 | 0,1378 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 49 000 000 | 4 900 000 |
| 9 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 36 | 623685505101000340 | 0,1640 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 214 870 | 44 000 000 | 4 400 000 |
| 10 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 37 | 623685505101000343 | 0,1607 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 214 870 | 43 000 000 | 4 300 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **25.08.2011 г. в 9.30.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **19.08.2011 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3600621080100 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600452694, код платежа – 04901.

На Лоты 2–8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На Лоты 9–10 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

# «Імідж прафесіі педагога — тэма выключнай важнасці»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так, сёлета колькасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ зменшылася на 13 тысяч. І ў наступныя гады яна таксама будзе змяншацца. Нават не ўсе бюджэтныя месцы ў ВНУ нам сёлета ўдалося запоўніць. А з улікам магчымасці атрымліваць вышэйшую адукацыю на платнай аснове конкурс на ўваходзе ў ВНУ ў хуткім часе ўвогуле можа знікнуць... Значыць, гэты крытэрый ужо страціў сваю актуальнасць. Упэўнены, што трэба з новых пазіцый паглядзець на вынікі адукацыйнай дзейнасці і ўвогуле на праблемы якасці адукацыі. Патрабуюцца новыя крытэрыі, паказчыкі, канкрэтныя вымяральныя эфектыўнасці дзейнасці навучальных устаноў і работы кожнага канкрэтнага педагога. На якія паказчыкі трэба нацэльваць педагагічны калектыў? У пагоні за эксперыментамі і інавацыямі ўнутраны змест адукацыі ні ў якім разе не павінен адыходзіць на другі план.

А як, напрыклад, ацэньваць якасць выхаваўчай работы? Толькі па адсутнасці сярод вучняў курцоў ці па адсутнасці здзейсненых школьнікамі правапарушэнняў? А можа быць, па колькасці здадзенай вучнямі школы макулатуры? Нельга скідваць з рахункаў і эканамічную эфектыўнасць дзейнасці сістэмы адукацыі. Давайце разам прааналізуем: а ці рацыянальна мы выкарыстоўваем бюджэтныя сродкі? Адукацыя становіцца ўсё больш дарагой. Ці трэба нам захоўваць усю сетку ліцэяў і каледжаў, ці трэба дубляваць падрыхтоўку па пэўных спецыяльнасцях у многіх сярэдніх спецыяльных навучальных установах і ВНУ? У краіне прыкладна трэцяя частка тых, хто атрымаў вышэйшую адукацыю, працуе не па сваёй спецыяльнасці ў іншых сферах! І гэта таксама паказчык эфектыўнасці работы сістэмы адукацыі. На жаль, не ўсім удаецца адразу на выхадзе са школы вызначыцца з выбарам прафесіі на ўсё жыццё. І не ўсе могуць сабе шчыра прызнацца ў здзейсненай памылцы, каб своечасова яе выправіць. Таму, напэўна, пытанні прафесійнай арыентацыі моладзі актуальныя сёння як ніколі раней. Мы бачым, што па многіх спецыяльнасцях трэба прыводзіць план набору ў адпаведнасці з рэальнымі патрэбамі рынка працы. Таму што нават калі студэнт і гатовы плаціць за сваё навучанне, то адразу пасля заканчэння ВНУ перад ім востра паўстане пытанне: дзе знайсці працоўнае месца? У той час як у іншых сферах адчуваецца кадравы голад... Працэсамі размеркавання моладзі па розных каналах навучання і падрыхтоўкі трэба кіраваць больш прынцыпова. Мяркую, што школа павінна навучыць дзяцей, асабліва старшакласнікаў, адэкватнай самаацэнцы, пераканаць дзіця і яго бацькоў знайсці іншы шлях прафесійнага самавызначэння, паказаць яму высокую запатрабаванасць рабочых прафесій.

***— Яшчэ колькі гадоў таму настаўнік, асабліва сельскі, быў бясспрэчным аўтарытэтам і для дзяцей, і для бацькоў сваіх вучняў. З настаўнікам звязвалася ўсё самае перадавое і прагрэсіўнае. Яго ўшаноўвалі і аберагалі. Было няпісаное правіла: пра настаўніка не гаварыць дрэнна. Аднак апошнім часам прыцягальнасць прафесіі педагога пачала імкліва зніжацца. Калі меркаваць па рэдакцыйнай пошце, то вялікая колькасць школьных педагогаў расчаравалася ў абранай прафесіі. Прычым яны ўвогуле не жадаюць, каб іх дзеці падоўжылі педагагічную дынастыю. На сумныя высновы наводзяць і вынікі прыёмнай кампаніі ў флагмане беларускай педагогіцы — Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце...***

— Імідж прафесіі педагога ў грамадстве — тэма выключнай важнасці. Як і якасны адбор прэтэндэнтаў на навучанне на педагагічных спецыяльнасцях. У настаўніцкай прафесіі не павінна быць выпадковых людзей. На жаль, але даводзіцца канстатаваць, што ў апошнія гады месца навучання ўсё часцей выбіраецца маладымі людзьмі не свядома, а стыхійна, зыходзячы з шанцаў быць залічанымі. Аднак мяркую, што трэба ўстанаўліваць для прэтэндэнтаў на атрыманне прафесіі настаўніка пэўныя бар'еры на ўваходзе, каб не было такіх прыкрых выпадкаў, калі студэнтамі педагагічнай ВНУ становяцца абітурыенты з некалькімі баламі ў сертыфікатах ЦТ. Вядома, калі студэнты не могуць выконваць патрабаванні вучэбных праграм, іх абавязкова адлічваюць. Ніхто не стане ахвяраваць якасцю адукацыі і рэпутацыяй навучальнай установы. І ўсё ж такі такія факты нельга дапускаць, бо ад гэтага церпіць імідж прафесіі педагога. Нельга перастварыць педагагічныя спецыяльнасці ў «запасны аэрадром» для маладых людзей, якім трэба толькі атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі. Ад узроўню інтэлекту і прафесійнага майстэрства настаўнікаў у многім залежыць якасць падрыхтоўкі будучых інжынераў, урачоў, эканамістаў, юрыстаў — гэта значыць, тых спецыялістаў, якія вызначаюць аблічча ўсёй краіны.

Фізіка з'яўляецца базавай дысцыплінай для ўсіх тэхнічных спецыяльнасцяў. І калі ў школе не будзе моцнага педагога, то адкуль могуць быць веды ў выпускнікоў? А што мы назіраем сёння падчас прыёмнай кампаніі? І належным запасам ведаў абітурыенты не могуць пахваліцца, і колькасць ахвотных паступаць на фізічны факультэт меншая за колькасць бюджэтных месцаў. Безумоўна, фізіка — няпросты прадмет. І праблемы з засваеннем дакладных навук характэрныя не толькі для нашых школьнікаў. І ўсё ж такі я ўпэўнены, што менавіта ад настаўніка залежыць, ці зможа ён захапіць сваім прадметам вучняў, ці зможа сфарміраваць у іх матывацыю да навучання. Калі б не было ў нашых школах Педагогаў з вялікай літары, то і перамог беларускіх школьнікаў на міжнародных алімпіядах па фізіцы не было б. Між іншым, сёлета нашы школьнікі заваявалі ў Бангкоку залаты медаль, два сярэбраныя і два бронзавыя. Гэта перамога не толькі дзяцей, але і іх педагогаў.

***— Сяргей Аляксандравіч, прызнайцеся, ці хвалюе вас выключна «жаночы твар» беларускай педагогікі?***

— Гэта таксама адно з наступстваў зніжэння прэстыжу прафесіі настаўніка ў нашым грамадстве. Ролю мужчыны-педагога ў школе вельмі цяжка пераацаніць. Колькасць няпоўных сем'яў пастаянна расце, у многіх сем'ях бацька свядома адхіляецца ад выхавання дзяцей. Асабліва ад гэтага церпяць хлопчыкі. А школьны настаўнік становіцца для іх і сябрам, і дарадцам, і старэйшым братам, і нават бацькам. Той факт, што мужчыны-педагогі, як правіла, карыстаюцца аўтарытэтам і сярод вучняў, і сярод бацькоў, тлумачыцца, напэўна, тымі абставінамі, што ў школе засталіся працаваць толькі тыя педагогі-мужчыны, якія калісьці здзейснілі свядомы прафесійны выбар і далей ад свайго выбару ў жыцці не адмаўляюцца. Педагогіка — гэта іх прызванне, і яны ў школе — невыпадковыя людзі. Праўда, педагогаў-мужчын і сапраўды становіцца ў школах усё менш, мужчыны не жадаюць ісці ў школу працаваць. Мяркую, што ўраду варта задумацца аб мерах матэрыяльнага заахвочвання, якія дапамогуць прывесці ў школу новых настаўнікаў-мужчын і ўтрымаць тых мужчын, якія пакуль яшчэ там працуюць.

***— Апошнім часам у краіне ўзяты курс на дэбюракратызацыю, аднак школу дэбюракратызацыя быццам бы і не закранула. Хутчэй, наадварот: інфармацыю ў школе збіраюць раённыя кіраўніцтвы адукацыі, аховы здароўя, культуры, а таксама ваенкаматы, міліцыя, МНС, БРСМ, спарткамітэты і мноства іншых арганізацый, якія выкарыстоўваюць школьных настаўнікаў для вырашэння ўласных праблем. Настаўнікі скардзяцца, што папяровы бюракратызм ужо пераўтвараецца ў пагрозу для іх фізічнага і псіхічнага здароўя. Для зносін з вучнямі часу проста не застаецца. Да таго ж з-за сваёй перагружанасці настаўнікі вымушаны ахвяраваць самаадукацыяй і ўласным развіццём...***

— Асноўная задача настаўніка — вучыць дзяцей, таму трэба вызваліць яго ад выканання ўсіх неўласцівых яму функцый, у тым ліку ад напісання шматлікіх даведак і справаздач. Вялікая колькасць дакументацыі, якую даводзіцца афармляць педагагічным работнікам, з'яўляецца сур'ёзнай праблемай для ўстаноў адукацыі. Аднак уклад Міністэрства адукацыі ў гэты папераварот — мінімальны. Самая вялікая колькасць папер прыходзіць не з міністэрства, не з упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў, а з райвыканкамаў. У многіх выпадках справаздачы рыхтуюцца ўвогуле на падставе вусных распараджэнняў работнікаў органаў кіравання адукацыяй ці пісьмовых указанняў зверху. Пры гэтым справаздачы носяць пераважна інфармацыйны характар і не могуць выкарыстоўвацца для аналізу адукацыйнага працэсу. Гэта інфармацыя ў большай ступені з'яўляецца сховішчам формаў пастаяннага кантролю кіруючых структур за работай устаноў адукацыі па розных напрамках дзейнасці. Міністэрствам адукацыі былі падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі па распрацоўцы гадавога плана і падрыхтоўцы справаздачнасці, скіраваныя на выключэнне залішняй бюракратыі на месцах. Але, відаць па ўсім, сітуацыя карэнным чынам не змянілася. Значыць, і тут нам ёсць над чым працаваць. Трэба, каб усе зразумелі, што калі мы будзем нацэльваць настаўніка адначасова і на выкананне плана па зборы металалому і макулатуры (гэтым павінны займацца грамадскія арганізацыі), і на запаўненне шматлікіх папер і справаздач, то для індывідуальнай работы з вучнем часу ў яго ніколі не знойдзецца. А без індывідуальнай работы з вучнямі пра якую эфектыўнасць педагагічнай дзейнасці можна весці размову? На які вынік прэтэндаваць?

Адным словам, праблем зашмат. Мяркую, што беларуская настаўнікі будуць удзячныя Прэзідэнту за тое, што ён прыняў такое рашэнне — адкрыта і чэсна аб усім пагутарыць. Сёння ўсім нам патрабуецца перасэнсаванне таго, што адбываецца не толькі ў школе, але і ва ўсёй сістэме адукацыі.

**Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.**

Так сталася, што з-за адсутнасці свайго інтэрнэт-форума ў беларускіх настаўнікаў менавіта сайт «Звязды» пераўтвараўся ў стыхійны форум, дзе настаўнікі дзяліліся адно з адным праблемамі і спосабамі свайго «выжывання» ў школе. Настаўнікі пісалі ў рэдакцыю лісты, тэлефанавалі і вельмі спадзяваліся, што іх меркаванні наверсе, нарэшце, пачуюць. Дазволім сабе нагадаць толькі пра некаторыя праблемы, якія ўзнімаліся педагогамі...

*«Хто толькі ні абвяшчае сёння правядзенне розных конкурсаў, спаборніцтваў і выстаў! Акрамя роднага міністэрства, якое рассылае палажэнне аб гэтых мерапрыемствах цэлымі стосамі, выхаваўчай работай з дзецьмі займаюцца дзясяткі розных міністэрстваў, ведамстваў, фондаў і аб'яднанняў. І ўсе палажэнні магутнай ракою сцякаюцца ў школу. А настаўнік ужо і не ведае, за што брацца: ці то за рэферат, ці то за малюнак, ці то за даследную працу, ці то за вiктарыну. І не адмахнешся ад усіх гэтых папер, бо найважнейшы паказчык работы школы — колькасць мерапрыемстваў, у якіх школа прыняла ўдзел, і колькасць прызавых месцаў у гэтых мерапрыемствах...»*

@

*«Чаму настаўнік павінен з 21.00 да 2.00 патруляваць па вуліцах і вылоўліваць школьнікаў па барах і дыскатэках? А дзе міліцыя? Я згодны патруляваць, але няхай тады міліцыянер прыходзіць і праводзіць за мяне ўрокі».*

@

*«Літаральна на кожным кроку ўсе гавораць аб правах дзіцяці. Увялі пасады сацыяльнага педагога, псіхолага і г.д. Распрацаваны спецыяльныя праграмы па вывучэнні правоў дзіцяці, але чамусьці ні слоўца пра абавязкі вучня. Вось і атрымліваецца, што дзіця правы свае ведае вельмі добра, а абавязкаў у яго — аніякіх. Усе абавязкі дзіцяці пераклалі на настаўніка. Сапраўды, у настаўніка няма ніякіх правоў, адны толькі суцэльныя абавязкі. Прашу ў Міністэрства адукацыі (думаю, што мяне падтрымае большасць настаўнікаў), каб вярнулі «двойцы» як ранейшую сілу і перасталі «душыць» настаўніка за сапсаваную «статыстыку». Прэстыж адукацыі можна ўзняць толькі тады, калі высокаадукаваны чалавек будзе атрымліваць значна больш, а вучань атрымае тую адзнаку, якую ён заслужыў. Тады і вучань задумаецца над тым, што без вучобы яму ў жыцці не абысціся».*

@

*Педсаветы ў школах даўно ператварыліся ў «пужалаўку», таму што на кожным з іх на галовы настаўнікаў вывальваецца чарговая порцыя загадаў, інструкцый, распараджэнняў. А дадаць чуеш фразу: «А калі вы не зробіце, не падрыхтуеце, не напішаце, вам за гэта будзе...» (у каго на што фантазіі хапае). Я яшчэ застала часы, калі на педсаветах сапраўды бурна абмяркоўвалі практычна кожнага вучня. У людзей гарэлі вочы! Мы за ідэю, а не з-пад палкі хадзілі па дамах, гадзінамі сядзелі на тэлефонах, размаўляючы з бацькамі. А зайдзіце ў школу цяпер. Згаслыя позіркі, запужанасць, хутчэй штосьці зрабіць і збегчы, каб вочы не бачылі. Ёсць адна прымаўка: «У нешчаслівай маці не можа быць шчаслівых дзяцей». Я яе перафразавала б так: «У нешчаслівага настаўніка не можа быць шчаслівых вучняў».*



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

**Организатор торгов:** Фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. (8017) 224 39 76, (8017) 500 47 10

**Место проведения торгов:** г. Минск, ул. Чкалова, 5

**Форма проведения торгов** – открытый аукцион

| Сведения о предметах торгов | |
|---|---|
| **Дата и время проведения повторных торгов:** | **14 сентября 2011 г. в 12.30** |
| **Изолированное помещение** (инв. № 630/D-24374), расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский район, д. Пекари. Нежилое помещение общ. пл. 36,4 кв.м, 1993 года постройки, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – междуэтажные железобетонные плиты. **Подробное извещение** о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» за 22 февраля 2011 г. № 34. | |
| **Начальная цена предмета торгов: 41 477 245** белорусских рублей. **Размер задатка: 4 000 000** белорусских рублей. *Начальная цена предмета торгов понижена на 50 %.* | |
| **Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» (Минский филиал, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, тел.: (8017) 222 75 85, 224 32 02, 213 28 18). | |
| **Задаток** для участия в торгах перечисляется с даты публикации данного извещения **по 12 сентября 2011 года** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами – **12 сентября 2011 г. до 12.00.** | |
| **Дата и время проведения торгов:** | **16 сентября 2011 г. в 11.00** |
| **Пассажирский теплоход «Бодрый»** (инв. № 01510020), 1956 года постройки, материал корпуса – сталь, габаритные размеры судна: длина 27,4 м, ширина 4,8 м, высота наибольшая надводная 4,48 м. Пассажировместимость – 150 человек. Объект находится по адресу: Минская область, Минский район, Заславское водохранилище. | |
| **Начальная цена предмета торгов: 16 080 000** белорусских рублей. **Размер задатка: 1 600 000** белорусских рублей. | |
| **Продавец:** Государственное учреждение «Санаторий «Юность» Управления делами Президента Республики Беларусь (Минская обл., Минский район, п/о Ратомка, тел.: (8017) 503 91 37, 503 91 05, 544 71 88). | |
| **Задаток** для участия в торгах перечисляется с даты публикации данного извещения **по 14 сентября 2011 года** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами – **14 сентября 2011 г. до 12.00.** | |

Текущий (расчетный) счет для внесения задатка для участия в торгах: № **3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, ул. Мясникова, 32, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в торгах.

**Заявления на участие в торгах** с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312, тел.: (8017) 224 39 76, (8017) 228 60 13.**

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленных торгах и предметах торгов дополнительно размещаются на сайте Минского облисполкома**: www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Для участия в торгах в указанный в извещении срок необходимо подать организатору торгов заявление на участие в торгах, к которому прилагаются следующие документы: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении); индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность. При подаче документов граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения торгов (продажи конкретного предмета торгов) в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение торгов, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников торгов до начала проведения торгов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: 1. Подписать протокол о результатах торгов. 2. Возместить затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для их проведения в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. 3. Подписать договор купли-продажи не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов при предъявлении копий платежных документов, подтверждающих перечисление суммы возмещения расходов, связанных с организацией и проведением торгов. Произвести оплату за объект в течение 30 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

## У РЭСПУБЛІКАНСКАЙ БАЛЬНІЦЫ СПЕЛЕАЛЯЧЭННЯ БУДЗЕ ПАБУДАВАНЫ НОВЫ СПАЛЬНЫ КОРПУС

**ПРЭЗІДЭНТ Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 11 жніўня падпісаў указ № 356 «Аб некаторых пытаннях будаўніцтва спальнага корпуса № 2 і рэканструкцыі спелеалячэбніцы дзяржаўнай установы «Рэспубліканская бальніца спелеалячэння», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

У адпаведнасці з дакументам у гэтай бальніцы будзе пабудаваны спальны корпус на 60 ложкаў.

Цяпер адной з актуальных задач медыцынскай навукі і практычнай аховы здароўя з'яўляецца распрацоўка і шырокае ўкараненне эфектыўных немедыкаментозных метадаў лячэння пацыентаў і медыцынская рэабілітацыя інвалідаў.

Захворванне бронха-лёгачнай сістэмы заняло першае месца па колькасці выпадкаў непрацаздольнасці сярод дарослага насельніцтва і колькасці выпадкаў выяўленых і ўзятых на дыспансерны ўлік як дарослага, так і дзіцячага насельніцтва. Асаблівае месца ў агульнай структуры паталогіі органаў дыхання належыць бранхіяльнай астме, якая з-за высокай распаўсюджанасці і частага развіцця інваліднасці перастала быць выключна медыцынскай і набыла вялікае сацыяльна-эканамічнае значэнне.

У 1990 годзе на базе калійнага рудніка 1-РУ ААТ «Беларуськалій» пачало функцыяніраваць падземнае аддзяленне спелеалячэння магутнасцю 60 ложкаў за змену. Цяпер арганізавана работа ў 2 змены, што дае магчымасць прыняць 120 пацыентаў.

Аналагаў такіх падземных аддзяленняў у сусветнай практыцы няма.

Рэспубліканская бальніца аказвае спецыялізаваную медыцынскую дапамогу пацыентам як бясплатна, так і на платнай аснове.

З мэтай паляпшэння доступнасці і якасці медыцынскай дапамогі насельніцтву метадам спелеатэрапіі паспела неабходнасць будаўніцтва другога падземнага аддзялення на 60 ложкаў за змену. Пры функцыянаванні такога падземнага аддзялення з'явіцца магчымасць дадаткова прымаць 120 пацыентаў за змену.

Новы спальны корпус павінен быць уведзены ў эксплуатацыю да 1 ліпеня 2012 года адначасова з уводам другога падземнага аддзялення.

### Грошы

## УКЛАДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ АМАЛЬ НА 1,1 ТРЫЛЬЁНА РУБЛЁЎ

**Як паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка, за мінулы месяц уклады насельніцтва (рублёвыя і ў замежнай валюце) у беларускіх банках павялічыліся на 4 працэнты (1,1 трыльёна рублёў). У пераліку на нацыянальную валюту на пачатак жніўня гэтыя ўклады дасягнулі больш як 28,5 трыльёна беларускіх рублёў. Усяго за сем месяцаў гэтага года ўклады павялічыліся на 5,6 трыльёна, або на 24,2 працэнта.**

За ліпень дэпазіты ў нацыянальнай валюце павялічыліся на 841,1 мільярда рублёў, у замежнай валюце — у эквіваленце на 61,8 мільёна долараў ЗША. На рост укладаў паўплывала павышэнне ўзроўню стаўкі рэфінансавання Нацбанка і адпаведна працэнтных ставак па дэпазітах у нацыянальнай валюце.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## МЯСНЫЯ ПРАДУКТЫ Ў ЛІДАРАХ ПА РОСЦЕ ЦЭН

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і платныя паслугі насельніцтву за перыяд з пачатку месяца да сярэдніх цэн ліпеня 2011 года склаў 101,7 працэнта.**

Найбольшы прырост цэн з пачатку месяца адзначаны на паўфабрыкаты мясныя з ялавічыны (10,4 працэнта), свініну (8 працэнтаў), яйкі курыныя (7,4 працэнта), ялавічыну першай катэгорыі (5,9 працэнта), алей (5,6 працэнта), тварог тлусты (5 працэнтаў), каўбасу паўвэнджаную (4,9 працэнта), хлеб і хлебабулачныя вырабы, маянэз, рыбу жывую, мяса птушкі, напіткі безалкагольныя, проса (3-4 працэнты), тканіны шаўковыя (8,5 працэнта), медыкаменты (5,7 працэнта), шпалеры (3,2 працэнта), посуд (2,9 працэнта), паслугі хімчысткі (5,8 працэнта), пасажырскага транспарту (5,1 працэнта), медыцынскія паслугі (3,1 працэнта), аплату жыллёва-камунальных паслуг (2,8 працэнта).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## НА МАКАВЕЯ

**багата людзей прыехала ў вёску Стары Дзедзін, што ў Клімавіцкім раёне.**

На ўзбярэжжы маляўнічай ракі Асцёр прайшлі святочныя тэатралізаваныя мерапрыемствы. Многія з іх нагадалі гасцям пра старадаўнія традыцыі. На свята завіталі лепшыя пчаляры раёна са сваёй карыснай прадукцыяй.

Адбыўся хрэсны ход да крыніцы «Бяздонны калодзеж». Як сцвярджае мясцовая легенда, на гэтым месцы раней стаяла царква, але яна праваліласяпад зямлю. Традыцыйна на Мядовы Спас адбываецца асвячэнне жыватворнай крыніцы. Людзі п'юць гэтую гаючую ваду, бяруць яе дадому.

**Таццяна ПАДЛІПСКАЯ. Фота аўтара.**



# ЭКАНОМІКА РЭГІЁНА: ПОЗІРК ЮРЫСТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яна дазваляла зрабіць сур'ёзныя вывады і паставіць грунтоўныя задачы. Праект рашэння аблвыканкама гэта даказаў.

Што датычыцца пытанняў эканамічнага блоку рэгіёна, дык і ён за апошнія шэсць месяцаў выглядаў годна: назіраецца станоўчая дынаміка ўсіх прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011 год. Прычым па сямі з іх выкананне забяспечана на ўзроўні, вышэйшым за гадавыя параметры (інвестыцыі ў асноўны капітал, рэнтабельнасць продажу ў арганізацыях сельскай гаспадаркі, экспарт тавараў, экспарт паслуг, паказчык па энергазберажэнні і іншыя). Аб'ём сабраных бюджэтных рэсурсаў павялічыўся на 42 працэнты, а паступленні ад падатку на прыбытак павялічыліся амаль удвая: у 1,8 раза.

Як бачым, база для аптымістычных прагнозаў ёсць.

Аднак пэўныя паказчыкі сведчаць і аб праблемах, якія існуюць у эканоміцы вобласці.

### Што рабіць з праблемамі?

Найперш — звернемся да іх аналізу.

**Па ўсёй вобласці:**

- нізкі працэнт прыцягнення прамых інвестыцый;
- зніжэнне сёлета за студзень—чэрвень 2011 года ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам аб'ёмаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, аб'ёмаў уводзення ў эксплуатацыю жылля за кошт усіх крыніц фінансавання;
- не вытрымліваюцца запланаваныя паказчыкі паступлення ад падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) (гадавы план выкананы на 44,2%), іншых падаткаў і зборах ад выручкі ад рэалізацыі тавараў (48,6%);
- тэмпы росту паступлення даходаў у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам склалі толькі 8,9%;
- вобласць займае апошнюю пазіцыю па аб'ёме паступленняў у бюджэт ад новых арганізацый;
- працягваецца рост пратэрмінаванай запазычанасці юрыдычных асоб аграпрамысловага комплексу ў бюджэты раёнаў.

**Па раёнах:**

- рост за студзень—чэрвень 2011 года суадносін запасаў гатовай прадукцыі і сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці;
- рост стратных прадпрыемстваў;
- не выкананы даведзеныя заданні па эканоміі рэсурсаў;
- зніжаны тэмпы росту інвестыцый у асноўны капітал камунальных унітарных арганізацый, гаспадарчых аб'яднанняў, у якіх вобласць ці яе адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка валодае акцыямі (долямі ва ўстаўным фондзе) у памеры больш за 50%;
- крэдыторская запазычанасць па бюджэце вобласці на 1 ліпеня г.г. склала 34,8 млрд рублёў, ці 35,4% — пратэрмінаваная запазычанасць, не пагашаная ў тэрміны, устаноўленыя дагаворамі;
- захоўваецца рост пратэрмінаванай запазычанасці юрыдычных асоб аграпрамысловага комплексу ў бюджэты раёнаў;
- назіраецца незаконнае атрыманне, выкарыстанне не па мэтавым прызначэнні і з парушэннем заканадаўства бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў (выяўлена ў 170 арганізацыях — 60 % ад правераных).

### Праект рашэння аблвыканкама: крокаў шмат, але недастаткова

Некаторыя канкрэтныя шляхі па рашэнні названых праблем былі пададзены ў праекце рашэння аблвыканкама. Прычым з прапанаваных мер відавочна, што пры аналізе эканамічнай сітуацыі ў вобласці і праектаванні выкарыстоўваліся разнастайныя метады і механізмы рэгулявання, у тым ліку і прававыя. Напрыклад, такія, як скарачэнне стратных арганізацый, прыватызацыя акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў, вылучэнне зямельных участкаў інвестарам згодна з нормамі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 жніўня 2009 года № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», пашырэнне сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і г.д.).

Нягледзячы на актуальнасць і патэнцыйную эфектыўнасць прапанаваных мер, з улікам рэальнай сітуацыі ў эканоміцы рэспублікі і вобласці іх, на жаль, недастаткова.

Напрыклад, падчас пасяджэння чамусьці гаворка вялася толькі пра стратнасць прадпрыемстваў, а неплацежаздольнасць нават не згадвалася. Аднак стратнасць — гэта паняцце больш шырокае і менш небяспечнае. Неплацежаздольнасць, калі яна набывае ўстойлівы характар, пагражае банкруцтвам з ліквідацыяй прадпрыемства-даўжніка. Таму аблвыканкам павінен пільна сачыць за лёсамі такіх арганізацый. Да таго ж на гэта скіроўваюць і адпаведныя даручэнні кіраўніка нашай дзяржавы.

З 2006 года ў вобласці дзейнічае камісія па ўдасканальванні плацяжоў і разлікаў. Чаму б ёй не даць права зацвярджаць графікі пагашэння запазычанасці па згодзе з бакамі дагаворных абавязацельстваў? Справа ў тым, што калі пытанне па спагнанні даўгоў мірна ўрэгуляваць не атрымоўваецца, крэдытор ідзе ў суд. А судовыя працэдуры — гэта дадатковыя і даволі значныя расходы. Мяркую, што такая актывізацыя дзейнасці камісіі дапаможа ў вырашэнні яшчэ адной праблемы рэгіёна. А станоўчы вопыт потым варта перадаць і раёнам.

Асабліва хацелася б спыніцца на стварэнні ў вобласці новых вытворчых арганізацый і прадпрыемстваў у малых і сярэдніх гарадскіх паселішчах. Яны ствараюцца — гэта факт. Але праблема ў тым, што паступленні ў бюджэт вобласці ад такіх арганізацый недастатковыя. Таму размову, хутчэй за ўсё, трэба весці пра разгляд выкананькамамі ўсіх узроўняў пытання аб неабходнай падтрымцы рэгіянальнага малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, а інакай — пра выкананне нормаў закона аб іх абароне, а таксама адпаведных патрабаванняў Дырэктывы № 4 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Напрыканцы звернемся да важнага тэзіса з паслання кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь: «Надалей рэгіянальная палітыка будзе накіравана на максімальна эфектыўную рэалізацыю магчымасцяў раёнаў Беларусі з улікам спецыфікі клімату, эканамічных і чалавечых рэсурсаў. Асаблівую ўвагу плануецца надаць выкарыстанню мясцовай сыравіны. У рэгіёнах варта актыўна развіваць перапрацоўчыя вытворчасці, рамёствы, малы бізнэс, аграэкатурызм, сацыяльную і фізкультурна-спартыўную інфраструктуру».

Нават такі кароткі аналіз сітуацыі ў межах газетнага артыкула сведчыць пра неабходнасць больш эфектыўнага выкарыстання прававых метадаў і ацэнак пры падвядзенні вынікаў дзейнасці эканомікі рэгіёна.

Віктар ГАНЧАРЭНКА.

Напярэдадні

## «ДОБРЫЯ КАМАНДЫ НЕ МОГУЦЬ ДВА РАЗЫ ЗАПАР ЗГУЛЯЦЬ ДРЭННА»

**СЁННЯ ўвечары на стадыёне «Дынама» БАТЭ сыграе першы матч раўнда плэй-оф Лігі чэмпіёнаў. Да групавой стадыі самага прэстыжнага еўракубка застаецца адзін крок. Тым больш што лёсаванне прынесла барысаўчанам аднаго з самых нескладаных супернікаў — аўстрыйскі «Штурм», які ў сёлетнім сезоне выступае так сабе: пасля чатырох тураў чэмпіянату клуб займае шостае месца. Напярэдадні адказнага матчу мы спыталі ў галоўнага трэнера БАТЭ пра падрыхтоўку да паядынку і настрой у камандзе.**

***— Віктар Міхайлавіч, у якім стане газон стадыёна «Дынама», на які пасля матчу з Балгарыяй скардзіўся трэнер нацыянальнай зборнай?***

— Мы ведаем, што супрацоўнікі стадыёна «Дынама» робяць усё магчымае. Прадказаць дакладна яго стан немагчыма: някая мы скардзіліся перад матчам, што поле дрэннае, а потым выйшлі на гульню — і газон быў выдатнай якасці.

***— Раскажыце пра страты ў складзе і хто зможа замяніць дыскваліфікаванага Рэнана Брэсана?***

— На жаль, у нас істотныя страты: Брэсан, Шытаў, Паўлаў, Ліхтаровіч. Пад пытаннем удзел Радзівонава. Але ў нас доўгая лаўка запасных, і тыя футбалісты, якія выйдуць, гатовы згуляць на высокім узроўні. Кадравыя страты яшчэ больш згуртавалі каманду, і на матчы вы гэта пабачыце.

***— Што зноў адбылося з Радзівонавым?***

— Ён доўга аднаўляўся пасля траўмы і ў гульні з «Экранасам» не павінен быў гуляць 90 хвілін. Але так атрымалася, што мы вымушаны былі яго выкарыстоўваць на працягу ўсяго паядынку. Ён перагрузіў пярэднюю мышцу і пакуль яна яго непакоіць.

***— Як мяркуеце, ці вялікай будзе цікавасць балельшчыкаў да матчу?***

— У нас невысокі кошт білетаў, якасны футбол, таму хацелася б, каб нас падтрымалі балельшчыкі.

***— Які настрой у камандзе пасля пройгрышу ў пятніцу ў чэмпіянаце «Мінску»?***

— Без паражэнняў не бывае перамог. Такія гульні ў плане выніку вельмі карысныя для каманды. Яны прымушаюць працаваць з канцэнтрацыяй і вялікім жаданнем пераадольваць няўдачы. Добрыя каманды не могуць два разы запар згуляць дрэнна.

***— Што вы ведаеце пра суперніка?***

— Як і немецкія, так і аўстрыйскія каманды вельмі арганізаваныя. Добра ўмеюць абараняцца і выконваць стандартныя становішчы. Ёсць і слабыя бакі, якія мы ўзялі на ўзбраенне.

***— Калі параўноўваць з камандамі, якія ў кваліфікацыі ў мінулых сезонах нас абыгралі — «Вентспілс», «Капенгаген», — то «Штурм» больш моцная каманда?***

— Улічваць трэба стан каманды на дадзены момант. Толькі гульня пакажа, наколькі моцны зараз «Штурм».

***— Як будзеце настройваць каманду на матч? Знойдзеце нейкія асаблівыя словы?***

— Зразумела, штосьці буду казаць гульцам. Але на матч такога ўзроўню асаблівы настрой не патрабуецца. Пасля гульні з «Мінскам» было ўсё відаць: гульцы адразу пастараліся забыць гэтую гульню, у іх вялізнае жаданне перамагчы.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.08.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| 1 долар ЗША ....5 028,00 | 1 чэшская крона ....296,79 | USD ....28,8576 |
| ▲ 1 еўра ....7 188,53 | 1 польскі злоты ....1738,29 | 10 UAH ....36,0585 |
| 1 латвійскі лат ....10 146,30 | ▲ 1 расійскі рубель ....174,23 | 10000 BYR ....58,3824 |
| 1 літоўскі літ ....2 084,15 | 1 украінская грыўня ....628,70 | EUR ....41,2895 |

## СВАЮ НАХАБНАСЦЬ ЗВАЛІЎ НА... СОНЦА

Малады брастаўчанін на машыне выскачыў на тратуар ў самай ажыўленай частцы горада, на скрыжаванні вуліц Савецкай і Пушкінскай, і затармазіў ля самых ног гараджанкі, што праходзіла побач, чым ледзь не да смерці спужаў жанчыну. З месца здарэння ён хацеў уцячы, але міліцэйскі нарад затрымаў хулігана. Той яшчэ спрабаваў аказаць супраціўленне. Неадэкватныя паводзіны 29-гадовы гора-вадзіцель тлумачыў павышанай сонечнай актыўнасцю і праблемамі ў асабістым жыцці.

**Яна СВЕТАВА.**




АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Купалинка» (продавец)** проводит повторный открытый аукцион по продаже **производственного изолированного помещения № 2** (инв. № 644/D-35376), об. пл. **2089,1 кв.м**, расположенного по адресу: **Солигорский р-н, Метявичское шоссе, д. 5.**

**Начальная цена с НДС – 2 300 000 000 бел. руб.**

Задаток 10% от начальной цены объекта перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369 г. Минск, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

**Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

*Предыдущее подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звезда» от 26.04.2011.*

Аукцион состоится **30.08.2011** в 15.00 по адресу: г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 58, к. 510 (зал заседаний). Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.08.2011** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова,5, к. 324.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

# «МАТАЛЯНЕ ВАМ ГАТУЮЦЬ, МАТАЛЯНЕ ВАС ЧАСТУЮЦЬ!»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Побач прымасціліся і ганчары, што тут жа, на вачах гледачоў, выраблялі збанкі і вазы. Можна было паназіраць за вытворчасцю драўлянага посуду і саламянага капелюша. Можна было ўсё гэта набыць. Гараджанкі куплялі мініяцюрныя шаткаўніцы для капусты. Вельмі зручна, нават калі квасіш адзін качан.

А каля святочнай пляцоўкі наведвальнікаў чакаў сюрпрыз. Трэба было прайсці праз незвычайную амбулаторыю. Сваімі палаткамі і мноствам людзей у белых халатах яна нечым аддалена нагадвала мабільны шпіталь МНС. Але на сталах стаяла шмат прысмакаў. «Лячэбнымі кроплямі» тут частавалі ўсіх ахвотных. Усіх заклікалі правяраць сваё здароўе, прайсці дыягностыку.

Тых, хто выклікаў «занепакоенасць», маглі пагрузіць на насілкі і аднесці ў «рэанімацыю», дзе ўжо лячылі па поўнай праграме, з выпіўкай на сёмі травах і здаровай закускай. І калі жанчыны трохі саромеліся такога аперытыву, то мужчыны, уцяміўшы, што там капаюць з мензурак, актыўна падыходзілі да вясёлых «медычак». Аказалася, што на свята да маталян прыехаў у госці самадзейны калектыў з Капыля. Гэта яны разгарнулі пацешную амбулаторыю і прывячалі ўсіх прыгожай беларускай мовай. У Моталі ж карыстаюцца пераважна сваёй палескай гаворкай.

Як заўважыў начальнік аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Уладзімір Шаляговіч, на «Мотальскіх прысмаках» цяпер не менш чым п'юць і ядуць, спяваюць і танчаць. Наогул фэст стаў культурнай з'явай цэлага палескага рэгіёна. Сёлета ён быў адметны дэманстрацыяй дзіцячай творчасці. Свае работы паказалі юныя мастакі, а маленькія самадзейныя артысты падаравалі публіцы добры канцэрт. Яны выступалі і ў асноўнай праграме.

Тую частку фестывалю, дзе паказвалі народныя рамёствы, абрады, традыцыі, назвалі «Крыніца бацькоўскай спадчыны». Адной з фішак праграмы можна, відаць, назваць нараджэнне мотальскага каравая, якое прайшло ў вясковай хаце ў першы дзень фэсту.

На свяце было нямала гасцей з розных краін. Нават з далёкай Індыі. Прысутных віталі намеснік старшыні аблвыканкама Леанід Цупрык, старшыня Іванаўскага райвыканкама Юрый Бісун. А госці з цікаўнасцю разглядалі ўсе экспазіцыі, і не толькі ўласна з прысмакамі.

«Агра-Моталь» — адно з самых моцных сельгаспрадпрыемстваў на Брэстчыне. Яго кіраўнік Вячаслаў Каштальян з задавальненнем праводзіў экскурсіі на імправізаванай выставе тэхнікі, розных сельгас-



культур і жывёлы. Ужо 16 гадоў кааператыў вырошчвае элітнае насенне. Ён дасягнуў у сваёй справе пэўных поспехаў. Азімыя і яравыя гатункі пшаніцы, жыта, трыцікале, кукурузы, бульбы купляюць у Моталі гаспадаркі ўсёй краіны.

Галоўнай часткай свята, як заўсёды, былі сталы з пачастункамі. Гаспадыні з Мотaля і навакольных вёсак прыгатавалі свае фірменныя стравы. Алена Падапрыгор, бібліятэкар з Псышчава, прывезла не толькі адметную кухню сваёй вёскі, але інтэрнацыянальныя стравы сваёй сям'і. Бацька яе з Украіны, маці — беларуска. У мужа бацька — румын, маці — малдаванка. «Ну і хто пасля гэтага мае дзеці?», — смяецца Алена. Дарэчы, у сям'і Алены перавагу аддаюць беларускай кухні з малдаўскімі матывамі. Таму яна прывезла горку бліноў, нечым нават падобных на армянскі лаваш. Гэта, як аказалася, малдаўскі хлеб. Алена з мужам — руплівыя гаспадары, на падворку маюць і кароўку, і свіней. І ўсе, хто частаваўся салам альбо свежым малаком са збанка, хвалілі псышчаўскую гаспадыню. А ў іншых удзельніц свята — з Дастоева, Ляскавічаў, Дружылавічаў — дранікаў, клёцак, пірагоў было на розны густ! За невялікую плату ахвотныя частаваліся рознымі стравамі. З графінаў ды заплеценых бутэлек налівалі фірменныя напоі. Тыя, хто каштаваў, звычайна ўздымалі вялікі палец.

У свяце палескай кухні ўзялі ўдзел і гаспадыні аграсядзіб. Адна з іх, Валянціна Застроўская з маленькай вёсачкі Вілы, прывезла стравы адразу з печкі: смажаныя грыбочкі, «бабку», розныя кашы, клёцкі. Разам з памочніцай Наталляй спадарыня Валянціна шчодра частавала гасцей ды запрашала да сябе ў сядзібу «Крыніца», дзе можна адпачыць і адчуць прыгажосць палескай прыроды.

Мотальскі фэст — найперш, вядома, свята жывата. Нават галоўную сцэну фестывалю ўпрыгожвалі вялікія плакаты з рэцэптамі мясцовых страў: «Бульбяная запяканка», «Капуста па-мотальску», «Млынцы жытнія». А вядучыя на гэты раз былі апрануты ў касцюмы кухараў. «Цвіком» культурнай праграмы стала дэфіле-карнавал кулінарных страў. Сапраўднай авацыяй сустрэлі гледачы дзяўчыну-каўбасу па-шыкалаеўску. Усе ведаюць мясцовага прадпрымальніка Сцяпана Шыкалая, які заснаваў прадпрыемства і дынастыю. Сёння кааператывам кіруе яго сын, Мікалай Шыкалай, і прадпрыемства мае больш за 200 аптовых пакупнікоў. Звыш 30 найменняў прадукцыі зараз выпускае кааператыў, і ўся яна адрозніваецца высокай якасцю. Каля іх выставачнага павільёна красавалася шыльдачка: «Без каўбасы не пацягнеш і касы». І выглядала па цяперашнім часе надзвычай актуальна...

Удзельніца дэфіле «Сала па-мотальску» таксама прыцягнула да сябе ўвагу гледачоў. «Сала па-мотальску» — гэта своеасаблівы брэнд для многіх прадпрыемстваў. Напрыклад, фермерская гаспадарка прадпрымальніка Ігара Мінюка добра вядомая ў рэгіёне. Каля яго павільёна затрымліваліся як на выставе, ля паўліна з каўбас ды чабурашкі з вантрабянкі так і шчоўкалі фотаапараты.

Вядома, не абышлося на дэфіле без капусты і бульбы. І нават песню самадзейныя аўтары напісалі спецыяльна да чацвёртага фестывалю, дзе паўтараецца прыпеў: «Маталяне вам гатуюць, маталяне вас частуюць».

А ўжо ў Моталі ўмеюць гатаваць. Нават па дарозе дадому ў аўтобусе давялося пачуць узнёслыя водгукі пра мотальскую кухню і гасціннасць. Адна сталічная дама начавала ў Моталі. Гаспадынька папыталася, ці не хоча госця да бульбы маласольных агуркоў. Тая згадзілася, а кабета кажа: «То зараз натрасу».

—?!

Аказалася, што такія гуркі можна прыгатаваць, нават калі 10 хвілін таму яны яшчэ раслі на градзе. Агурок рэжацца на невялікія кавалкі, на смак дадаецца соль, дробна парэзаны кроп. І абавязкова — часнок. Усё гэта трэба заліць вадой, шчыльна закрыць слоік і трэсці ў руках каля дзесяці мінут. Пасля чаго маласольныя агуркі падаюцца на стол.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

**Падпіска-2011**

# СА «ЗВЯЗДОЮ» — ПА ЖЫЦЦІ!

Крыху больш за месяц застаецца да заканчэння падпіснай кампаніі на 4-ы квартал 2011 года. Зараз, калі можна так сказаць, пачынаецца актыўная фаза ў яе правядзенні. Супрацоўнікі рэдакцыі «Звязды» вельмі спадзяюцца, што кола прыхільнікаў на старэйшае беларускамоўнае выданне як мінімум застанецца стабільным. Безумоўна, мы будзем прыкладаць максімум намаганняў, каб чытацкая аўдыторыя пашыралася. Для гэтага творчыя работнікі газеты будуць імкнуцца яшчэ больш аператыўна рыхтаваць у нумар змястоўныя матэрыялы, якія многіх зацікаваць. Разумеем, што вельмі важным момантам у «сяброўстве» са «Звяздой» з'яўляецца матэрыяльнае заахвочванне. Паспяшаемся запэўніць, што стымул застанецца для кожнага падпісчыка. Для іх рэдакцыя газеты па-ранейшаму працягне штоквартальныя розыгрышы прызоў. Дарэчы, у самы бліжэйшы час мы працягнем выезды «ў народ» — у самыя розныя рэгіёны краіны даставім каштоўныя прызы ўсім шчаслівчыкам — па выніках падпіскі на 3-ці квартал гэтага года. Уручэнні падарункаў па добрай традыцыі адбудуцца з удзелам ідэалагічных работнікаў мясцовай «вертыкалі» і РУП «Белпошта».

Сёння ж нам хацелася павіншаваць з поспехам у прасоўванні сярод грамадскасці брэнда «Звязды» нашых галоўных памочнікаў — паштальёнаў і работнікаў кіёскаў РУП «Саюздрук». Па выніках сумеснага конкурсу многія з іх стануць уладальнікамі каштоўных прызоў і грашовых прэмій.

**З задавальненнем паведамляем, што па выніках конкурсу «Прыз — руплівам паштальёну» прызавы фонд размеркаваўся наступным чынам.**

**ПАДПІСКА НА 4-ы КВАРТАЛ 2011 ГОДА**
***Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)***

| Індэкс | месяц | квартал |
|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | 14600 | 43800 |
| **63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)** | 13400 | 40200 |
| **63858 (ведамасны)** | 24800 | 74400 |
| **63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)** | 22200 | 66600 |

***Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белпошта»***

| Індэкс | месяц | квартал |
|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | 13350 | 40050 |
| **63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)** | 12150 | 36450 |
| **63858 (ведамасны)** | 22511 | 67533 |
| **63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)** | 20140 | 60420 |

***Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»***

| Індэкс | месяц | квартал |
|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | 13250 | 39750 |
| **63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)** | 12120 | 36360 |
| **63858 (ведамасны)** | 19591 | 58773 |
| **63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)** | 18063 | 54189 |

***Заставайцеся з намі!***

**Машына кухонная «Белвар»**

1. Арабей Валянціна Сяргееўна, паштальён АПС Дзятлавічы Лунінецкага РВП (Брэсцкая вобласць).
2. Максімовіч Васіль Леанідавіч, паштальён АПС Краснalукі Чашніцкага РВПС (Віцебская вобласць).
3. Падалінская Анжэла Міхайлаўна, паштальён АПС №13 г. Мазыра (Гомельская вобласць).
4. Боўшыс Валянціна Генрыхаўна, паштальён АПС Доцішкі Воранаўскага РВПС (Гродзенская вобласць).
5. Фаміна Анастасія Сяргееўна, паштальён АПС №30 г. Магілёва.
6. Каляда Таісія Канстанцінаўна, паштальён АПС «Знамя» Слуцкага РВПС (Мінская вобласць).

**Электрафен «Віцязь»**

1. Шышко Алена Іванаўна, паштальён АПС Заверш'е Драгічынскага РВПС (Брэсцкая вобласць).
2. Дземянцей Галіна Канстанцінаўна, паштальён АПС Чашнікі-1 Чашніцкага РВПС.
3. Мажака Галіна Аляксандраўна, паштальён АПС Верасніца Жыткавіцкага РВПС (Гомельская вобласць).
4. Качан Марыя Іванаўна, паштальён АПС Нягневічы Навагрудскага РВПС (Гродзенская вобласць).
5. Бічан Тамара Аляксандраўна, паштальён АПС Пласток Любанскага РВПС (Мінская вобласць).

**Электрачайнік Polli-N**

1. Запаро Мікалай Васільевіч, паштальён АПС Цяпіна Чашніцкага РВПС.
2. Вараповіч Ала Дзянісаўна, паштальён АПС Азёры Гродзенскага РВПС.
3. Ладуцька Надзея Віктараўна, паштальён АПС Шчыткавічы Старадарожскага РВПС.

Яшчэ раз віншуем усіх уладальнікаў каштоўных прызоў ад «Звязды». Упэўнены, што паштавікі і ў далейшым будуць даволі актыўна прыцягваць усё новых падпісчыкаў. Свае прызы звяздоўскія лаўрэаты могуць атрымаць у рэдакцыі газеты «Звязда», пачынаючы з сённяшняга дня.

Праўда, цудоўна разумеем, што з-за вытворчай занятасці зрабіць гэта будзе не так проста. Таму ў самы бліжэйшы час супрацоўнікі газеты пастараюцца даставіць прызы па месцы работы паштальёнаў і ўручыць іх ва ўрачыстай абстаноўцы.

*Свае «прызавыя» атрымаюць і работнікі РУП «Саюздрук» па выніках сумеснага конкурсу «Лепшаму кіяскёру — звяздоўскі прыз».*

**Вось як размеркаваліся грашовыя прэміі па 100 тысяч рублёў.**

1. Пашкевіч Тамара Віктараўна, павільён № 263 РУП «Белсаюздрук» (г. Мінск).
2. Шчансновіч Людміла Аляксандраўна, магазін «Прэса Маркет» г. Маладзечна (Мінская вобласць).
3. Гаўрылавец Вольга Леанідаўна, кіёск № 3 г.п. Лельчыцы (Гомельская вобласць).
4. Родзіна Таццяна Анатольеўна, кіёск № 3 г.Барань (Віцебская вобласць).

У сувязі з тым, што пераможцамі конкурсу сталі тры кіяскёры, якія працуюць у адным павільёне № 3 г. Магілёва, то, у адпаведнасці з Правіламі гульні, грашовая прэмія будзе пароўну падзелена паміж Сцяпанавай Галінай Мікалаеўнай, Лісавай Наталляй Аркадзьеўнай і Альшэўскай Элеанорай Уладзіміраўнай (РУП «Магілёўсаюздрук»). У Гродне прызавыя падзеляць паміж сабой супрацоўніцы кіёска № 60 Каспяровіч Вера Валянцінаўна і Венская Хрысціна Чаславаўна (РУП «Гроднааблсаюздрук»), а ў Ляхавічах — работніцы кіёска № 1 Паўлоўская Вольга Мікалаеўна і Кульчык Таццяна Збігнатаўна (РУП «Брэстаблсаюздрук»).

**Яшчэ раз віншуем!**
**Падтрымаем «Звязду» разам!**

**Здарэнні**

## СУТЫКНЕННІ ЛЕГКАВІКОЎ З ГРУЗАВЫМІ ЦЯГНІКАМІ

**Адразу два сутыкненні легкавікоў з цягнікамі адбылося з розніцай у некалькі гадзін.**

Напачатку ў 21.27 відавочца патэлефанаваў па нумары «101»: на чыгуначным пераездзе каля вёскі Кашалева Брэсцкага раёна грузавы састаў сутыкнуўся з легкавіком «Аўдзі-100». Апошнім кіраваў пенсіянер 1948 года нараджэння, прычым у машыне знаходзіўся толькі адзін кіроўца. Мужчына шпіталізаваны ў Брэсцкую абласную бальніцу ў стане сярэдняй ступені цяжкасці. Рэгулюемы пераезд не ахоўваўся, быў абсталяваны спраўнай светлавой і гукавой сігналізацыяй. Затрымкі ў руху склалі: дызель-цягніка № 6361 Лунінец — Брэст 20 хвілін, электрацягніка № 6312 Брэст — Мінск — 40 хвілін.

А ўжо ў 0.50 у Дзяржынскае падраздзяленне МНС тэлефанавала дзяжурная па чыгуначнай станцыі «Негарэлае». Тут на рэгулюемым пераездзе на перагоне «Коласава — Негарэлае» паблізу вёскі Клачкі сутыкнуліся грузавы цягнік, які перавозіў каменны вугаль, і легкавік «Рэно-Кліа». У апошнім было пяць чалавек, двое з якіх з траўмамі рознай ступені цяжкасці былі шпіталізаваны ў Дзяржынскую раённую бальніцу. Работнікі МНС таксама дасталі з-пад цягніка аўтамабіль. Па словах дыспетчара па Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, затрымка ў руху цягнікоў на гэтым участку склала 1 гадзіну 15 хвілін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ С ОБОРУДОВАНИЕМ РУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ЗАВОД ХИМИЧЕСКОГО МЕЛА»

Организатор аукциона антикризисный управляющий Дайнеко О.А.
Аукцион состоится **30 августа 2011 года в 11.00**
по адресу: г. Гомель, ул. Достоевского, 1, к. 12

| Номер лота, наименование здания | Площадь здания | Начальная стоимость с НДС | Задаток 10 % от стоимости |
|---|---|---|---|
| 1. Отделение приготовления с оборудованием | 525,5 м$^2$ | **155 789 676** белорусских рублей | **15 578 968** белорусских рублей |

Ознакомиться со зданием с оборудованием можно в месте его расположения по адресу: г. Гомель, ул. Достоевского, д. 1.

Заявление с документами в соответствии с законодательством, а также документ, подтверждающий перечисление задатка на р/счет продавца 3012204500014 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское облуправление г. Гомель, МФО 151501912, УНП 400021246 принимаются организатором аукциона с момента опубликования данного извещения по адресу: г. Гомель, ул. Достоевского, д. 1, к. 12 в рабочие дни с 8.30 до 17.00 **по 29 августа 2011 года включительно.**

Победителем аукциона будет признан участник, предложивший наибольшую цену. Результаты аукциона оформляются протоколом, подписываемым в день проведения аукциона. Лицо, являющееся победителем аукциона, обязано возместить затраты, связанные с организацией и проведением торгов, подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней и оплатить приобретенный объект в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Объект продается в собственность.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть продан этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Первое извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 13 мая 2011 года.

За дополнительной информацией по подготовке и проведению аукциона обращаться по телефонам: т./ф.: 8 0232 36 34 50, 8 029 652 76 97, 8 029 662 05 52.

## Валютчыкі актывізаваліся

**На мінулым тыдні на Брэстчыне затрымалі некалькі чалавек, якія праводзілі незаконныя валютныя аперацыі. Усе яны лічацца беспрацоўнымі, але пры сабе мелі значныя сумы грошай.**

А лідарам у гэтым плане можна лічыць 30-гадовага жыхара в. Альшаны (Столінскі раён). У яго канфіскавалі 23 млн беларускіх рублёў, больш за 14 тыс. расійскіх і амаль 14 тысяч долараў ЗША.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Скраў з мясакамбіната

Супрацоўнікі міліцыі каля ААТ «Міёрскі мясакамбінат» затрымалі 28-гадовага работніка гэтага прадпрыемства, які вынес мясной прадукцыі на тры мільёны рублёў. Было гэта а першай гадзіне ночы. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ

| № лота | Наименование объекта/ Краткая характеристика | Адрес объекта | Продавец | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание «Производственный корпус» (инв. № 350/С-9761)** Здание общей площадью 11100,2 кв.м | г. Гомель, ул. Ильича, 331 | ОАО «Гомельское ПО «Кристалл» | 13 218 237 600 | 1 321 823 760 |

Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 15%, вознаграждение – 1% от цены продажи лота.

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 14 сентября 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **15 сентября 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер БАНК», ЦБУ 5, ул. Платонова, 1б, БИК 153001820, УНП 807000214 |
